**Гісторыя арганізацыі і развіцця сельскай гаспадаркі раёна.**

У другой палове XV стагоддзя на цяперашняй тэрыторыі раёна, ў межах маёнткаў, як цэнтры гаспадарчай дзейнасці пачалі ўзнікаць фальваркі. Так, у Мірскім графстве фальваркі Аюцавічы, Жухавічы, Мір, Тулонка, а ў маёнтку Карэлічы фальваркі Беразавец, Брольнікі, Крыні, Кукаловічы, Паланая, Стрэльнікі. Пачынаючы з XVI стагоддзя пачалі ўзнікаць мястэчкі “Цэрын” Цырын (1529г.), “Малышычы” Малюшычы (1532г., канчаткова не сфармавана), Карэлічы (1594г.), Ярэмічы (1647г.), Турэц (1648г.). У другой палове XVI і на пачатку XVII стагоддзяў у цэлым завяршылася фарміраванне феадальнай сістэмы. Юрыдычна было замацавана права на валоданне зямлёй, асобныя прывілеі і абавязкі шляхты, пазбаўленне сялян права на зямлю, замацаванне іх за зямлёй і прымушэнне да працы. Большасць зямель належала шляхце, якая дзялілася на групоўкі па эканамічнай моцы і па палітычнай ролі ў дзяржаве. Каля палавіны сялянскіх гаспадарак належала моцным землеўладальнікам, што мелі маёнткі. Сярэдняя шляхта мела амаль пятую частку сялянскіх гаспадарак. Дробная шляхта, як самая шматлікая група, валодала астатняй часткай.

Сістэма пазямельных адносін, якая стыхійна складвалася на працягу стагоддзяў, у ходзе аграрнай рэформы была ўпарадкавана. Адзінкай падаткаабкладання была прынята валока зямлі, якая з’яўлялася зямельнай мерай роўнай 21,36 га і адначасова выступала як норма павіннасцяў. Сялянскія сем’і замацоўваліся за валокай ці яе часткай, станавіліся як бы дадаткам да яе, часткай уласнасці землеўладальніка.

У той час эканамічнае жыццё на цяперашняй тэрыторыі раёна праходзіла пад уплывам завяршэння ў 1583 годзе Лівонскай вайны і прыняццем у 1588 годзе Трэцяга Статута Вялікага Княства Літоўскага. Закон станоўча паўплываў на стабілізацыю і рост эканомікі тэрыторыі і ў першую чаргу яе галоўнай галіны – сельскай гаспадаркі. Як аснова эканомікі сельская гаспадарка перажыла пэўны ўздым, абумоўлены як пашырэннем сферы таварна-грашовых адносін, ростам попыту на сельскагаспадарчую

прадукцыю на ўнутраным і знешнім рынках, так і завяршэннем у асноўным аграрнай рэформы. Створаныя за гэты час фальваркі пачалі даваць прыбытак, павялічваюцца плошчы ворыўнай зямлі, расце вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі.

Такім чынам, да сярэдзіны XVII стагоддзя на цяперашняй тэрыторыі раёна ўсталяваліся дзве асноўныя формы гаспадарання- фальваркі і паншчына. Пры ўвядзенні фальваркаў і паншчыны ў якасці асноўнай павіннасці, сяляне былі пераведзены на грашовую рэнту. Сялянін быў практычна безабаронны ў прававым сэнсе і цалкам залежаў ад уласніка зямлі, на якой ён пражываў. Статутныя нормы гарантавалі землеўладальнікам поўнае права распараджэння прыгоннымі. Прыгонным сялянам забаранялася набываць ва ўласнасць зямлю, пакідаць уладанне. Землеўладальнік у любы час мог адабраць зямельны надзел у свайго падданага, перасяліць яго ў іншае месца, прадаць з усёй яго маёмасцю, зямлёй і без зямлі іншаму землеўладальніку, закласці пад пэўную грашовую суму.

Другая палова XVII і пачатак XVIII стагоддзяў праходзілі ў глыбокім эканамічным заняпадзе і марудным узнаўленні сельскай гаспадаркі. У гэты час цяперашнюю тэрыторыю раёна закраналі шматлікія войны. З 1648 года па 1654 год антыфеадальная вайна, з 1654 года па 1667 год вайна Расіі з Рэччу Паспалітай, з 1655 года па 1660 год польска-шведская вайна і з 1700 года па 1721 год Паўночная вайна. У выніку войнаў, няўстойлівых палітычных абставін і выкліканых імі неўраджаяў, эпідэмій і хвароб скарацілася колькасць насельніцтва, што пацягнула за сабой значнае скарачэнне ворыўнай зямлі, а гэта ў сваю чаргу ўзмацненне эксплуатацыі сялянства. Сярод сялянскіх павіннасцяў паншчына займала да 4-5 і нават да 6 дзён з цяглай валокі ў тыдзень, акрамя таго, сяляне павінны былі выконваць фурманкавую павіннасць, вартаваць маёнтак, рамантаваць дарогі і масты, удзельнічаць у гвалтах, талоках, працаваць на панскіх агародах. Захоўваліся натуральная даніна і грашовы чынш. Асабліва цяжкае становішча было ў тых сялян, што працавалі на землях феадалаў арандатараў. Яны каб атрымаць ад

маёнткаў найбольшы даход, нярэдка павялічвалі павіннасць звыш усякіх нормаў.

У другой палове XVIII стагоддзя цяперашняя тэрыторыя раёна ў складзе Рэчы Паспалітай і скіраванасць эканамічнага развіцця была ў бок пашырэння таварна–грашовых адносін і далейшаму ўмацаванню і росту феадальнай гаспадаркі. Гэта было абумоўлена ростам цэн на зерне на знешнім рынку. Асноўнай формай гаспадарання застаўся фальварак, удзельная вага прыватнага землеўладання была асноўнай і толькі пятая частка зямлі належала дзяржаве і царкве.

Большая частка зямель у межах сучаснага раёна належала Радзівілам і Хадкевічам, а астатнімі землямі валодалі прадстаўнікі сярэдняй і дробнай шляхты. Важнейшай галіной сельскагаспадарчай вытворчасці ў той час было земляробства. Пануючай сістэмай земляробства з'яўлялася трохполле, аднак у асобных маёнтках назіралася ўжо развітая сістэма шматпольных севазваротаў. Фальваркавыя палеткі засявалі зернявымі, бабовымі і тэхнічнымі культурамі. Больш за палову плошчаў пасеваў займала азімае жыта. Другой важнейшай сельскагаспадарчай галіной была жывёлагадоўля. У асноўным фальварскія гаспадаркі былі забяспечаны як працоўнай, так і прадукцыйнай жывёлай. Вырошчвалі буйную рагатую жывёлу, свіней, авечак і хатнюю птушку. У маёнтках асаблівая ўвага звярталася на развядзенне рабочай жывёлы. Так , у Карэлічах існаваў племянны конны завод. (Козловский П.Г. Магнатское хозяйство Белоруссии во второй половине XVIII века. С. 61,62.). Надменнай часткай фальварскага гаспадарання з'яўлялася агародніцтва, садаводства, пчалярства і рыбаводства. З 1808 года некаторыя фальваркі пачалі вырошчваць бульбу. Паступова пачалі развівацца разнастайныя прамысловыя промыслы, такія як вінакурэнне, млынарства, выраб алею.

Для сялянства перыяд XVI- XVIII стагоддзяў таксама быў нялёгкі для жыцця і працы. Заканадаўча было аформлена манапольнае валоданне зямлёй, сяляне, абапіраючыся на права маглі праводзіць гандлёвыя аперацыі з

зямлёй, але гэта з’ява была хутчэй адзінкавай і адыходзіла ў нябыт. Каб пракарміць сям’ю і даваць прыбытак свайму гаспадару, сялянскі надзел па падліках тагачасных эканамістаў, павінен быў быць не меней 0,5 валокі зямлі (болей 10 гектараў) і як сведчаць дакументы, плошча сярэдняга сялянскага надзелу на той час зрэдку была менш чым 0,5 валокі. Калі надзел быў меншы, ён дапаўняўся так званымі прыёмнымі землямі, за якія сплачвалі меншыя падаткі. Былі выпадкі ўтойвання ворнай паднадзельнай зямлі, каб наогул не адбываць з яе ніякіх павіннасцей.

Сялянскі двор меў назву “дым”, што азначала сям’ю, радзей некалькі сем’яў. Важнейшай прыладай земляробчай працы з’яўлялася саха і плуг. За кошт селяніна кармілася шляхта, дзяржава і царква. На іх карысць прыгонныя адпрацоўвалі шматлікія павіннасці. Галоўныя з іх былі паншчына, дзякля і чынш. Паншчыну мужчыны і жанчыны адбывалі зімой і летам, на яе сяляне выходзілі ці з рабочай жывёлай, ці па неабходнасці без яе, дзень пачынаўся з узыходам і заканчваўся з заходам сонца. Спазненне ці нявыхад жорстка караліся. Нормы прымусовай працы ў гаспадарцы пастурова павялічвалася. Так, у маёнтку Карэлічы Наваградскага ваяводства, які належаў Радзівілу, цяглыя сяляне ў 1672 годзе адбывалі паншчыну 4 дні з валокі і 5-ы дзень з “дыма” на тыдзень. Да 1746 года ў падданых гэтага ўладання паншчына павялічвалася да 12 дзён на тыдзень з валокі на сям’ю.

Сяляне выконвалі і адработачныя павіннасці, такія як гвалты, талокі і згоны. На гэтыя работы выходзілі ўсёй сям’ёй, пакідаючы дома нямоглага ці хворага. Выконвалася таксама і падводная павіннасць. Каб выканаць яе неабходна было на асабістай жывёле даставіць панскія грузы да месца прызначэння, што на доўгі час адрывала селяніна ад зямлі. Акрамя ўсяго пералічанага прыгонныя адбывалі так званыя старажоўшчыну, шараваркі (рамонт і будаўніцтва дарог, маёнткаў) і іншыя адработкі.

На першым месцы сярод грашовых падаткаў быў чынш, стаўкі якога былі неаднолькавыя, але даволі высокія. Чыншавыя сяляне мелі большую гаспадарчую самастойнасць, чым паншчынныя. Селянін акрамя чынша яшчэ

плаціў мноства падаткаў. Грашовае – адзін грош з кожнага злотага, што ішоў на чынш, угайнае, ялавічнае – за карыстанне лясноымі угоддзямі, чопавае – за выраб алкаголю і г.д. Усяго налічвалася больш 50 найменаванняў грашовых пабораў. Прадуктовым паборам стабільна з’яўлялася дзякла, гэта жыта, ячмень, авёс, птушка, яйкі, хмель і інш.

У XIX  і на пачатку XX стагоддзяў землі цяперашняга раёна далучаны да Расійскай імперыі і ўключаны ў сістэму агульнарасійскага рынку. Польскія і апалячаныя памешчыкі як былі, так і засталіся валадарамі зямлі і жыцця сялян. Асноўную масу насельніцтва складалі прыгонныя сяляне, якія падзяляліся на дзве групы – памешчыцкія і дзяржаўныя. У сваю чаргу памешчыцкія падзяляліся на паселеных і дваровых. Паселеныя сяляне атрымоўвалі зямельны надзел, які юрыдычна належаў памешчыку і займаліся сельскай гаспадаркай, дваровыя - абслугоўвалі памешчыка і яго сядзібу. Значную частку сялян складалі агароднікі, якія мелі толькі сядзібу з агародам. Павіннасці сялян засталіся амаль без змены.

Вайна 1812 года прынясла сельскай гаспадарцы рэгіёна вялікія матэрыяльныя і значныя людскія страты. Прадукцыя сельскагаспадарчай вытворчасці ў асноўным ішла для забеспячэння напалеонаўскай арміі прадуктамі харчавання і фуражом. Пасчаўся заняпад сельскагаспадарчай вытворчасці, які працягваўся да канца вайны.

У пасляваенны час сельская гаспадарка заставалася па-ранейшаму вядучай галіной эканомікі. На той час пераважала трохпольная сістэма ярына – азімыя – папар, а дзе-нідзе яшчэ захавалася аблогавае карыстанне зямлёй. Нярэдкай з’явай у прыгонніцкай вёсцы былі неўраджаі і голад, а ўраджайныя гады былі вельмі рэдка. Нізкая ўраджайнасць была непазбежным спадарожнікам прыгонніцкай сістэмы з яе прымітыўнай тэхнікай земляробства і невысокай прадукцыйнасцю прыгонніцкай працы. Ураджайнасць па ярыне і азімых не перавышала 3,5 чвэрці збору на кожную чвэрць пасеву. Сярод сельскагаспадарчых культур, якія апрацоўваліся, пераважалі так званыя “шэрыя” хлябы жыта і ячмень. З 1840 года

пашыраюцца пасевы бульбы, якая з агародняй культуры становіцца палявой, істотна павялічваюцца пасевы цукровых буракоў.

Прыгонная сельская гаспадарка як памешчыцкая, так і сялянская, паступова набывала таварны характар, трапляючы ў сферы ўплыву рынка. Росту таварнасці сельскай гаспадаркі садзейнічала павялічэнне вывазу сельскагаспадарчых прадуктаў за межы тэрыторыі. Паступова пачала стыхійна складвацца спецыялізацыя рэгіёна. Галоўнымі прадметамі вывазу былі збожжа, лён, ільняны алей, пянька, каноплі, воск, лес, скура і іншыя. Асноўнымі пастаўшчыкамі таварнага збожжа былі памешчыкі, але і сяляне таксама прадавалі частку свайго хлеба.

Развіццё таварна-грашовых адносін падштурхоўвала памешчыкаў прыстасаваць сваю гаспадарку да патрэб унутранага і знешніх рынкаў рэгіёна, павысіць даходнасць маёнткаў. Гэта ажыццяўлялася правядзеннем рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў у сваёй гаспадарцы і шляхам узмацнення прыгонніцкай эксплуатацыі сялян. Памешчыкі пачынаюць уводзіць у сваіх маёнтках лепшае насенне, новыя сарты збожжавых культур, пашыраць пасевы льну, бульбы, сеяць кармавыя травы і выкарыстоўваць земляробчыя машыны.

Развіццё капіталізму і паглыбленне крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы прымусіла царызм адмяніць прыгоннае права і правесці ў 1861 годзе зямельную рэформу. Згодна з рэформай памешчыкі заставаліся ўласнікамі зямлі, але частка яе выдзялялася для надзелаў сялян. На працягу 9 гадоў сяляне павінны былі трымаць выдзелены надзел і выконваць вызначаныя павіннасці. Да заключэння выкупной здзелкі сяляне не маглі адыходзіць ад памешчыка без яго дазволу. Пачаўся паўстанцкі рух сялян і ў 1863 годзе было спынена часоваабавязковае становішча сялян, ўведзены абавязковы выкуп надзелаў, зніжэнне плацяжоў.

Пасля рэформы на цяперашняй тэрыторыі раёна налічвалася 87 памешчыцкіх маёнткаў. Самым буйным землеўладальнікам быў П. Вітгенштэйн, яму належылі маёнткі Аюцавічы, Беразавец, Вялікае Сяло,

Замір'е, Карэлічы, Мір, Пясочнае. Лічыліся буйнымі маёнткі Варонча А. Мержэеўскага, Вобрына К. Кашчыца, Пузіневічы (Працяневічы) А. Русецкага, Райца Ф. Верашчакі, Дорагава Ф. Бараноўскага. Астальныя каля 20 маёнткаў належылі дробным памешчыкам, шляхце і багатым сялянам-кулакам.

Далейшае эканамічнае развіццё патрабавала агранізацыі перапрацоўкі мясцовай сельскагаспадарчай прадукцыі і сыравіны. У больш буйных маёнтках пачалі дзейнічаць вінакурныя, піваварныя, шкіпітарныя, крухмальныя, сыраварныя і масларобчыя заводы, млыны і крупарушкі. Паступлова павялічвалася колькасць насельніцтва, ўтвараліся новыя фальваркі. У 1897 годзе ў Жухавіцкай воласці іх было 33, у Райцаўскай – 34, у Цырынскай – 48, у Ярэміцкай – 32, у Карэліцкай – 21, у Мірскай – 12. Усяго было 5 мястэчак, 159 вёсак, 23 засценкі, 9 аколіц і 147 фальваркаў. (Эберхардт П. Демографическая ситуация на Беларуси. 1879-1989. Минск. 1997г.).

На пачатку XX стагоддзя захавалася буйнае памешчыцкае землеўладанне, адработкі, арэнда з часткі ураджаю. Павялічылася аграрнае перанасяленне і яшчэ больш стала малазямельных. Абвастрыліся сацыяльныя супярэчнасці, што выклікала ўзмацненне барацьбы сялян супраць памешчыкаў і самадзяржаўя, пачаліся забастоўкі пастаянных і надзённых рабочых. З лістапада 1906 года пачала праводзіцца зямельная рэформа і ўтварэнне хутарской сістэмы землеўладання, але яна не атрымала падтрымкі сялянства. Часовы спад сялянскага руху зноў ажывіўся ў 1910 годзе, але 19.07.1914г. пачалася першая сусветная вайна і тэрыторыя рэгіёна на доўгі час аказалася на лініі фронту, ці ў прыфрантавой паласе. У 1915 годзе фронт стабілізаваўся на р.Сэрвач і Карэліцкая, Райцаўская, Цырынская воласці былі акупіраваны нямецкай арміяй на тры з лішнім гады. Акупацыйная ўлада ператварыла захопленыя землі ў крыніцу сыравіны і таннай рабочай сілы. Мірская, Жухавіцкая і Ярэміцкая воласці апынуліся ў прыфрантавой паласе. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі з 18.03.1918г. немцы перайшлі ў

наступленне па ўсяму фронту і тэрыторыя была поўнасцю пад акупацыяй. У снежні 1918 года Чырвоная Армія вызваліла рэгіён, але з 19.03.1919г. ён быў заняты польскімі войскамі і ў адпаведнасці з Рыжскім мірным дагаворам 18.03.1921г. тэрыторыя цяперашняга раёна адышла да Польшчы. У 1923 годзе згодна з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам было 6 вясковых гмін, у складзе якіх было 5 мястэчкаў, 154 вёскі, 127 фальваркаў, 23 засценкі, 13 аколіц, 25 асад, а непасрэдна на цяперашняяй тэрыторыі раёна 5 мястэчкаў, 120 вёсак, 96 фальваркаў, 16 засценкаў, 8 аколіц і 17 асад.

Сельская гаспадарка як і раней складае аснову эканомікі рэгіёна. Закон аб зямельнай рэформе прыняты сеймам Польшчы ў 1925 годзе прадугледжваў вызначэнне памераў надзелаў і продаж праз Зямельны банк часткі зямлі буйных памешчыкаў, ліквідацыю зямель сумеснага карыстання памешчыкамі і сялянамі, звядзенне ў адзін участак дробных сялянскіх палосак і высяленне сялян на хутары. Пачалося асадніцтва, бясплатная або за невялікую плату перадача памешчыцкіх зямель польскім каланістам. Усё гэта значна знізіла прадукцыйнасць і таварнасць сельскай гаспадаркі. Як ні стараліся малазямельныя сяляне, але з-за недахопу сродкаў яны не маглі забяспечыць добрай апрацоўкі зямлі, падняць культуру земляробства і прадукцыйнасць жывёлагадоўлі. Цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю былі нізкімі.

У час эканамічнага крызісу 1929-1933гг. узмацніліся пратэсты сялян супраць эксплуатацыі. На тэрыторыі цяперашняга раёна жыхары ўдзельнічалі ў палітычных кампаніях і массавых выступленнях, аднак праводзімыя польскім урадам рапрэсіі ў 1937-1938 гадах прывялі іх да заняпаду. З 17.09 1939г. тэрыторыя рэгіёна вызвалена Чырвонай Арміяй. У першыя дні вызвалення на сходах жыхароў былі выбраны валасныя камітэты ў мястэчках Міры, Карэлічах, Турцы, Цырыне, Жухавічах і Райцы, а ў астатніх вёсках сельскія. У кастрычніку, пасля канфіскацыі, камітэты падзялялі памешчыцкую зямлю і інвентар паміж малазямельнымі сялянамі і парабкамі, у вёсцы праводзілася арганізацыя кааперацыі. Праз спажывецкую

кааперацыю сяляне куплялі па дзяржаўных цэнах сельскагаспадарчы інвентар, сартавое насенне, а ўзамен прадавалі прадукцыю сваёй гаспадаркі. Аднак гэта не магло цалкам вызваліць сялян ад малазямелля, да таго ж працягвалася драбленне сялянскіх гаспадарак у выніку сямейных падзелаў, таму пачалі стварацца першыя калектыўныя гаспадаркі. Значныя сацыяльна - эканамічныя і культурныя пераўтварэнні мянялі аблічча тэрыторыі, стваралі ўмовы для далейшага паступальнага развіцця, аднак напад гітлераўскай Германіі спыніў гэты працэс. У час акупацыі сельская гаспадарка прышла ў заняпад. Пасля вызвалення ў ліпені 1944 года з восенні пачалося аднаўленне сельскай гаспадаркі, якое адбывалася на аснове дробных індывідуальных сялянскіх гаспадарак. Сувязі паміж прамысловасцю і імі ўмацоўваліся праз дзяржаўны гандаль і спажывецкую кааперацыю, пашыралася кантрактацыя, ствараліся пракатныя пункты для дапамогі сялянам у апрацоўцы зямлі. У 1948- 1950 гадах на тэрыторыі цяперашняга раёна была праведзена калектывізацыя сельскай гаспадаркі. Калектывізацыя праходзіла фарсіраванымі тэмпамі і без уліку канкрэтных умоў. Гэта прывяло к таму, што у дробных калектыўных гаспадарках адсутнічалі сродкі, каб забяспечыць стварэнне належнай матэрыяльна-тэхнічнай базы, забяспечыць павышэнне матэрыяльнага і культурнага ўзроўню калгаснікаў. Толькі ў 1953 годзе было вырашана істотна ўмацаваць матэрыяльна-тэхнічную базу сельскіх калектыўных гаспадарак. Была спісана  запазычанасць з калгасаў і саўгасаў, нядоімкі з калгаснікаў па сельгаспадатку, павялічыліся капіталаўкладанні на патрэбы вёскі, прадугледжвалася павышэнне нарыхтоўчых цэн на абавязковыя пастаўкі. Усе гэта садзейнічала павышэнню грамадскай вытворчасці і калектыўнае гаспадаранне на зямлі захавалася да нашых дзён.

ВЕТЭРАН  ПРАЦЫ, КРАЯЗНАВЕЦ

Б.К. НАВІЦКІ (КАРЭЛІЧЫ)